*З.А. КУНІЦКАЯ*

# УНУТРЫПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС УЛАДЫ Ў ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ (1918)

На основе документальных источников рассматривается противостояние местных властей и руководства Западной области, возникшее в результате проведения Областным исполнительным комитетом Западной области централизаторской политики.

On the basis of existing documents the article analyses the confrontation between local and central authorities of Western Region, which rose as a result of centralisation policy carried out by Regional Executive Committee of Western Region.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у сістэме адміністрацыйнага ўпраўлення ўзнікаюць новыя звёны - абласныя аб'яднанні. Неакупіраваная тэрыторыя Беларусі (Мінская, Магілёўская, Віцебская і часткова Віленская губерні) увайшла ў склад Заходняй вобласці, кіраўніцтва якой здзяйсняў Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронта (Аблвыкомзах). Наступление нямецкіх войскаў у лютым 1918 г. прымусіла Аблвыкомзах эвакуіравацца з Мінска ў Смаленск, які стаў новым цэнтрам вобласці. Афіцыйнае аб'яднанне Смаленскай губерні з рэшткамі Магілёўскай і Віцебскай адбылося ў красавіку 1918 г. на II з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці.

Замена старога апарата ўпраўлення Саветамі суправаджалася паўсюдным аслабленнем сувязей паміж рознымі рэгіёнамі Расіі. Пад уплывам У.І. Леніна і І.В. Сталіна савецкі ўрад з вясны 1918 г. узяў курс на цэнтралізацыю краіны. Ідэя моцнай цэнтральнай улады была папулярна сярод многіх бальшавікоў Заходняй вобласці, але бачанне яе рэалізацыі было некалькі іншым. Будучая Расійская рэспубліка ўяўлялася ім аб'яднаннем моцных цэнтралізаваных абласцей, якія, аднак, няўхільна праводзілі б усе распараджэнні цэнтральнай улады. Так, рэзалюцыя па фінансаваму пытанню, прынятая II з'ездам Саветаў Заходняй вобласці, указвала, што "правільная фінансавая сістэма можа быць пабудаваная толькі ў агульнадзяржаўным маштабе, і таму менавіта на цэнтральнай уладзе ляжыць абавязак распрацоўкі сістэмы абкладання" (тут і далей перакпад аўтара. - *З. К.).* II з'езд Саветаў Заходняй вобласці пастанавіў скасаваць у сваіх межах камісарыяты і саўнаркомы, якія ўспрымаліся цэнтрам як сімвалы сепаратызму і месніцтва, і стварыць пры ўсіх Саветах як у абласным маштабе, так і на месцах аддзелы на чале з загадчыкамі[1].

Бальшавікі Заходняй вобласці, тым не менш, намагаліся ўмацаваць пазіцыі абласнога цэнтра, пашырыць яго самастойнасць і ўладныя паўнамоцтвы. Летам 1918 г. імі быў распрацаваны праект Канстытуцыі Заходняй Камуны, згодна якому вышэйшая ўлада ў ёй належала камунальным з'ездам Саветаў. У прамежку паміж імі камунай кіраваў СНК Заходняй Камуны, які аб'ядноўваў у сваіх руках заканадаўчую і выканаўчую ўлады. Ён быў адказны і падсправаздачны цэнтральным савецкім органам. Усе справы, грашовыя сумы, справаздачнасць і г. д. перадаваліся Савету Народнай Гаспадаркі Заходняй Камуны. Моцную цэнтральную ўладу забяспечвала скасаванне губвыканкомаў. Пры гэтым не прадугледжвалася вылучэнне з'ездам ніякіх іншых органаў[2], што супярэчыла савецкай традыцыі, бо і цэнтральны, і абласныя СНК, пакуль яны яшчэ існавалі, выконвалі выканаўчыя і распарадчыя функцыі і былі падсправаздачны выканкому[3]. Прычынай ліквідацыі такога важнага структурнага звяна савецкай улады, як выканаўчы камітэт, магла стаць незадавальняючая праца Аблвыкомзаха, у выніку якой прынцыповыя пытанні вырашаліся толькі ў абласным камітэце партыі[4]. Аб лёсе гэтага праекта мала вядома. Звестак аб тым, што ён быў зацверджаны органамі ўлады Заходняй Камуны ў архівах і перыядычным друку таго часу знайсці не ўдалося. Можна меркаваць, што характар праекта быў расцэнены як сепаратысцкі або незалежны, і ён не быў адобраны Масквой.

Такім чынам, следуючы ўласнаму палітычнаму курсу, Аблвыкомзах з мэтай пашырэння сваёй улады за кошт губернскіх выканкомаў імкнуўся да іх ліквідацыі. Першай "ахвярай" стаў Смаленскі губвыканком, які на той момант перажываў крызісны перыяд у сувязі з яго расколам на "рэвалюцыйную меншасць" і "кулацкую большасць", якая складала 2/3 выканкома. Прычым першыя распусцілі другіх і, прызнаўшы немэтазгоднасць самастойнага існавання, зліліся з Абл-

выкомзахам. Такі крок даў магчымасць смаленскім камуністам узяць верх над сваімі палітычнымі праціўнікамі, а абласному выканкому - замацавацца на но-вым месцы і стварыць прэцэдэнт для падобных дзеянняў. Пытанне аб лёсе Смаленскага губсаўдэпа было вынесена на разгледжанне II абласнога з'езда Саветаў, які 13 красавіка прыняў рэзалюцыю аб яго ліквідацыі. Аблвыкомзах узяў на сябе функцыі губернскага цэнтра па кіраўніцтву дзейнасцю павятовых Саветаў. Афіцыйна гэта тлумачылася немэтазгоднасцю існавання двух вялікіх савецкіх органаў у адным горадзе. Адносна астатніх губернскіх Саўдэпаў з'езд прыйшоў да наступнай высновы: "Часова, да разрашэння пытання аб існаванні губернскіх выканаўчых камітэтаў цэнтральнай уладай, выканаўчыя камітэты Магілёўскай і Віцебскай губерняў працягваюць сваё існаванне, кіруючыся паста-новамі абласнога цэнтра". Трэба адзначыць, што ліквідацыя гэтых абодвух вы-канкомаў мела аб'ектыўныя падставы. Дэмаркацыйная лінія, устаноўленая Брэсцкім мірам, разрэзаўшы напалову Магілёўскую і адарваўшы паўночную частку Віцебскай, пакінула 12 паветаў гэтых дзвюх губерняў без земскіх апа-ратаў, што прывяло да поўнага спынення гаспадарчага жыцця[5], Сітуацыя ўскладнялася тым, што пасля заняцця немцамі Магілёва губвыканком эвакуіра-ваўся ў павятовы горад Мсціслаўль, і большасць яго ўстаноў не паспела вые-хаць. Узнавіць усе аддзелы не ўдалося[6], а існуючыя - не здолелі наладзіць працу на адпаведным узроўні[7]. Таму павятовыя выканаўчыя камітэты падтрым-лівалі сувязь непасрэдна з Аблвыкомзахам, абміноўваючы губернскія органы[8].

Шэраг канфліктаў абласнога цэнтра з губернскімі выканкомамі толькі ўзмац-няў іх узаемнае жаданне ўстараніць саперніка. Так, калі Віцебскім гарадскім Саўдэпам была прынята пастанова аб абкладанні віцебскай буржуазіі кантры-буцыяй у памеры шэсць мільёнаў рублёў, то ў Смаленску гэта расцанілі як пера-вышэнне ўлады і парушэнне пастановы II з'езда Саветаў Заходняй вобласці, рэзалюцыя якога па фінансаваму пытанню не дазваляла мясцовым Саветам новае абкладанне насельніцтва[9].

У канфліктах варагуючыя бакі часта звярталіся за падтрымкай і дапамогай да цэнтральных органаў улады, не грэбуючы пры гэтым узаемнымі абвінавач-ваннямі і абразамі. "Праца Магілёўскага і Віцебскага губернскіх цэнтраў зводзі-лася, галоўным чынам, да самаіснавання"[10] - так характарызавалася дзейнасць гэтых губсаўдэпаў у дакладной запісцы АВК, прызначанай у НКУС. Віцебскі губвыканком на спробу правесці рэвізію аднаго са сваіх аддзелаў рэагаваў на-ступным чынам: "Аблвыкомзах у інтарэсах сваёй палітыкі скасавання губцэнтраў з дапамогай левых эсэраў стараецца дыскрэдытаваць аддзел". Такое сцвяр-джэнне пасля леваэсэраўскага мяцяжу магло стаць сур'ёзным абвінавачваннем. Далей у дакуменце пасля абгрунтавання сваёй пазіцыі ідзе просьба не верыць вынікам рэвізіі.

Выконваючы ў гэтых канфліктах ролю трацейскага суддзі, Масква займала не адназначную пазіцыю. Відавочна, па Заходняй вобласці СНК РСФСР яшчэ не была выпрацавана дакладная лінія, бо назіралася няўзгодненасць у дзеяннях розных камісарыятаў, што часта прыводзіла да дэструктыўных вынікаў. Так, за-гадчык арганізацыйнага аддзела Камісарыята харчавання дасылаў тэлеграмы па харчорганах Магілёўскай губерні з прапановай не падначальвацца абласно-му аддзелу забеспячэння. Гэта дало падставу Магілёўскаму харчоваму камітэту заявіць аб непадначаленні яго прадпісанням і, такім чынам, не здаць вобласці некаторыя лішкі хлеба, што меліся ў яго распараджэнні і былі прызначаны для галадаючых Смаленскай і Віцебскай губерняў.

Гэта падаецца абсурдам, бо Заходняя вобласць была прызнана як сама-стойная гаспадарчая адзінка[11], калі не прыняць да ўвагі, якой вастрыні дасяг-нула пытанне будучага адміністрацыйнага ўладкавання Расійскай рэспублікі ў 1918 г. Паралельнае існаванне губерняў і абласцей прызнавалася немэтазгод-ным. Захаванне якога звяна найбольш аптымальна? Не валодаючы палітычным вопытам, правіцелі Расіі не мелі дакладнага плана дзеянняў, таму ініцыятыва знізу магла стаць прыкладам для дзяржаўнага ўладкавання ўсёй краіны. Заха-ваўшы Заходнюю вобласць і ўмацаваўшы там цэнтральную ўладу шляхам ска-савання губерняў, Масква атрымлівала адзіны арганізм, але арганізм досыць

самастойны і, мабыць, схільны да сепаратызму, дзе без складанасцей можна было б забяспечыць правядзенне сваёй палітыкі. Пры адваротным варыянце большую незалежнасць набывалі губерні, кантраляваць якія, з прычыны іх аддаленасці ад цэнтра і шматлікасці, было б вельмі ўскладнена.

Упершыню пытанне "губерня ці вобласць" абмяркоўвалася на з'ездзе загадчыкаў аддзелаў унутраных спраў Заходняй вобласці ў чэрвені 1918 г. Даклады дэлегатаў у асноўным давалі пазітыўную адзнаку дзейнасці Аблвыкомзаха. У выніку спрэчак была прынята рэзалюцыя, якая выказвалася за ліквідацыю губернскіх і захаванне абласнога цэнтра[12].

Каб стварыць практычнае абгрунтаванне ліквідацыі, Аблвыкомзахам у Магілёўскую і Віцебскую губерні былі накіраваны камісіі па іх абследаванню. У справаздачах аддзела ўпраўлення Заходняй вобласці вельмі негатыўна характарызавалася дзейнасць савецкіх органаў губцэнтраў[13]. На наступным пасяджэнні Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) была прынята пастанова аб неабходнасці скасавання Віцебскага і Магілёўскага Саўдэпаў і аб'яднання пры гэтым усіх губерняў у адзінку, якая б кіравалася абласным выканкомам[14]. Для ажыццяўлення гэтага рашэння быў неабходны дазвол вышэйстаячых органаў.

Пасяджэнне прэзідыума УЦВК 25 ліпеня дало прынцыповую згоду[15]. Тэлеграма, падпісаная наркомам унутраных спраў Пятроўскім, паведамляла, што для *фармальнага* прызнання абласной дзяржаўнай арганізацыі неабходна рашэнне ўсіх павятовых выканаўчых камітэтаў. Аднак абапірацца на іх ніхто не збіраўся, бо тут жа прапаноўвалася заняцца ўладкаваннем абласнога Народнага банка, казначэйства, Казённай палаты, непасрэдна праз якія меркавалася ажыццяўляць асігнаванне павятовых І валасных выканаўчых камітэтаў. Меркавann! павятовых выканкомаў раздзяліліся: адны стаялі за захаванне губцэнтраў, іншыя - за іх скасаванне. Адзначым, што павятовых цэнтраў, якія лічылі залішняй інстанцыяй губернскія, было значна больш, чым тых, якія выказвалі супрацьлеглую думку. Асноўнай матывацыяй першых была добра наладжаная сувязь з Аблвыкомзахам, пры якой губерня становіцца непатрэбнай[16].

Хутка Аблвыкомзах атрымаў згоду на рэалізацыю планаў ад свайго непасрэднага начальніка. Тэлеграма НКУС ад 20 ліпеня дазваляла скасаванне Магілёўскага губвыканкома. Але самавольна распаўсюджваючы гэты дазвол, 5 жніўня АВК пастанавіў ліквідаваць акрамя Магілёўскага і Віцебскі губернскі выканаўчы камітэт. Апарат жа Смаленскага на той момант ужо амаль поўнасцю зліўся з абласным цэнтрам[17]. Гэтым рашэннем Аблвыкомзах рабіў чарговы крок па пераўтварэнню Заходняй вобласці ў цэнтралізаваную і адносна самастойную частку РСФСР. Натуральна, што такая палітыка выклікала супрацьдзеянне і ў першую чаргу губернскіх улад. Рэзалюцыя Віцебскай губернскай партыйнай канферэнцыі (2-6 жніўня) патрабавала скасаваць Аблвыкомзах як палітычны і адміністрацыйны цэнтр[18]. З боку работнікаў Магілёўскага губвыканкома назіралася процідзеянне працы спецыяльнай камісіі па ліквідацыі яго аддзелаў. Віцебскія і магілёўскія камуністы не падпарадкоўваліся рашэнням абласнога камітэта, парушаючы пры гэтым партыйную дысцыпліну[19].

Масква, ад якой залежала вырашэнне канфлікту, толькі 18 жніўня дала свой канчатковы адказ прадстаўнікам Віцебскай губерні. Было прапанавана захаваць абодва цэнтры (абласны і губернскі). Першы, пры забароне права звязвацца непасрэдна з паветамі, браў на сябе кіраўніцтва другім[20]. Сфера кампетэнцыі губвыканкомаў абаранялася ад замахаў АВК, і, такім чынам, на нейкі тэрмін дасягалася мірнае суіснаванне[21]. Прычынай такога рашэння магло стаць тое, што ў вышэйшых колах улады ўжо ставілася пад сумненне мэтазгоднасць існавання саміх абласцей. Пытанне аб абласных аб'яднаннях заняло ключавое месца на I з'ездзе старшынь выканкомаў РСФСР, дзе была прызнана магчымасць стварэння абласных аб'яднанняў толькі пры ўмове гаспадарча-эканамічнай агульнасці губерняў і іх аддаленасці ад цэнтра[22].

13 верасня 1918 г. III з'езд Саветаў Заходняй вобласці прыняў рашэнне, якое перакрэслівала цэнтралізатарскія памкненні Аблвыкомзаха: губвыканкомы, не здольныя працаваць (Магілёўскі), распускаліся. І толькі. Пастанова прадугледжвала, што пры вызваленні раёнаў Магілёўскай губерні ад нямецкіх акупантаў

зноў аднаўляецца губцэнтр. Для ліквідацыі Магілёўскага губвыканкома была створана спецыяльная камісія, але скасаваць яго Аблвыкомзах не паспеў, бо пачалося вызваленне захопленых тэрыторый [23].

Сведчаннем таго, што канфлікт зайшоў занадта далека і набыў ужо не прынцыповы, а асабісты характар, з'уляецца наступны крок Віцебскага губернскага камітэта партыі. Для адпраўкі ў цэнтр была абрана дэлегацыя, каб прасіць вылучыць Віцебскую губерню са складу Заходняй вобласці і прадаставіць ёй права непасрэднай сувязі з цэнтрам. "Калі ж у Маскве знойдуць неабходным для Віцебскай губерні знаходжанне ў складзе вобласці, хадайнічаць аб яе ўключэнні ў Паўночную". Віцебскія камуністы справядліва апасаліся помсты абласнога камітэта. І яна хутка паследавала.

Зразумела, што, пазбавіўшы праціўнікаў "галавы", лягчэй з імі расправіцца. 14 верасня ў Віцебск прыйшла тэлеграма аб пераводзе І.А. Меніцкага, старшыні выканкома, у Смаленск. Самага актыўнага праціўніка як Заходняй вобласці ў прыватнасці, так і прынцыпа абласнога дзялэння ў цэлым, які вёў супраць Аблвыкомзаха актыўную агітацыю, запрашалі ў яго склад! У будучым, калі спатрэбіцца ліквідаваць абласныя цэнтры, такую ж тактыку прыменіць Масква. Але сепаратысцкія памкненні віцебскіх бальшавікоў патрабавалі больш пакарання, чым павышэння па службе іх завадатара. 28 верасня быў пераабраны непакорны Віцебскі камітэт партыі, туды ўвайшлі "таварышы, жадаючыя ў цесным кантакце працаваць з абласным камітэтам...". Пасля таго, як абласны камітэт дэлегаваў у Віцебскі губвыканком сваіх работнікаў, і "праца", якую яны там правялі, у корні знішчыла непаразуменні, што існавалі паміж абласным і Віцебскім выканаўчымі камітэтамі[24].

1918 стаў годам пошука для маладой савецкай дзяржавы спосабаў існавання і шляхоў развіцця. Агульным накірункам савецкага ўрада ў галіне дзяржаўнага будаўніцтва стаў курс на цэнтралізацыю. Калі мэта была зразумела, то задачы выклікалі цяжкасці. Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці прапанаваў сваю мадэль: моцная абласная ўлада пад поўным кантролем цэнтра. Заходняя вобласць, сабраная з рэшткаў акупіраваных губерняў, у 1918 г. уяўляла сабой прыфрантавы ўчастак. Намаганні Аблвыкомзаха былі накіраваны на пераўтварэнне яе ў адзіны гаспадарчы і палітычны арганізм. Для чаго, у першую чаргу, неабходна было пераадолець цэнтрабежныя сілы, якія падтрымліваліся губвыканкомамі. Супрацьстаянне апошніх і Аблвыкомзаха прыняло досыць вострый характар.

[1] Гл.: Дзяржаўны архіў Смаленскай вобласці. Ф. 161. Воп. 1. Спр. 29. Л. 10, 13.
[2] Гл.: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 59. Воп. 1. Спр. 18. Л. 51.

Мн., 1959. С. 113.
[4] Гл.: НАРБ. Ф. 59. Воп. 1. Спр. 11. Л. 128.
[5] Гл.: Там жа. Ф. 35. Воп. 1. Спр. 44. Л. 20, 50, 55.
[6] Гл.: Нестеренко Е.И., Осмоловский В.П. Советы Белоруссии. Октябрь 1917 - январь 1919 / Под ред. И.М. Игнатенко. Мн., 1989. С. 116.

[8] Гл.: Нестеренко Е.И., Осмоловский В.П. Указ. сач. С. 117.
[9] Гл.: НАРБ. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 366. Л. 14-15.
[10] Там жа. Ф. 59. Воп. 1. Спр. 18. Л. 22.
[11] Гл.: Там жа. Ф. 35. Воп. 1. Спр. 44. Л. 51, 55, 230.
[12] Гл.: Там жа. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 366. Л. 41-46.
[13] Гл.: Там жа. Ф. 35. Воп. 1. Спр. 44. Л. 56-58.
[14] Гл.: Там жа. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 368. Л. 1.
[15] Гл.: Там жа. Ф. 35. Воп. 1. Спр. 44. Л. 226.
[16] Гл.: Там жа. Ф. 59. Воп. 1. Спр. 18. Л. 27-46, 47.
[17] Гл.: Там жа. Ф. 35. Воп. 1. Спр. 44. Л. 51, 229.
[18] Гл.: Там жа. Ф. 59. Воп. 1. Спр. 17. Л. 59, 63.
[19] Гл.: Там жа. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 280. Л. 2; Спр. 368. Л. 4.
[20] Гл.: НАРБ. Ф. 59. Воп. 1. Спр. 17. Л. 68.
[21] Гл.: Там жа. Ф. 60. Воп. 3. Спр. 368. Л. 7.
[22] Гл.: Серебрякова З.Л. Областные объединения Советов России. М., 1977. С. 175-176.
[23] Гл.: Нестеренко Е.И., Осмоловский В.П. Указ. сач. С. 117.
[24] Гл.: НАРБ. Ф. 59. Воп. 1. Спр. 17. Л. 18; Спр. 18. Л. 50, 99; Спр. 11. Л. 78.

Паступіў у рэдакцыю 14.01.04.

***Зоя Аляксандраўна Куніцкая*** - аспірантка кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кіраўнік - доктар гістарычных навук, прафесар У.К. Коршук.